**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2025 г.

### <u>Мерапрыемствы да Міжнароднага дня роднай мовы</u>

**19 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» прайшла літаратурна-музычная імпрэза «Адчуем водар мовы роднай». Перад вучнямі выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПаэтоКо» Наталля Кандрашук. Вакальны гурт «Фантазія» упрыгожыў мерапрыемства музычнымі нумарамі.

Установа, 22 чал.

**20 лютага. Кобрын.** Музычна-паэтычная гадзіна «Беларускай мовы рысы непаўторныя» прайшла ў чытальнай зале ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма».

Установа, 24 чал.

**21 лютага. Кобрын.** Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў бібліятэцы прайшоў літаратурна - музычны вечар «Родная мова - крыніца празрыстая».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 41 чал.

**21 лютага. Кобрын.** Да Міжнароднага дня роднай мовы ў бібліятэцы прайшла гадзіна зносін «Лашчаць слых словы роднай мовы».

Філіял «Стрыгаўская сельская бібліятэка», 26 чал.

**21 лютага. Кобрын.** Бібліятэка правяла літаратурны квэст «Жыве ў вяках беларускае слова», які быў прымеркаваны да Міжнароднага дня роднай мовы.

Філіял «Астроміцская сельская бібліятэка», 16 чал.

**21 лютага. Кобрын.** Да Міжнароднага дня роднай мовы у бібліятэцы прайшла літаратурная гадзіна «Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся».

Філіял «Лукская сельская бібліятэка», 20 чал.

**22 лютага. Кобрын.** Філіял «Залеская сельская бібліятэка» арганізавала раённы конкурс беларускай паэзіі у рамках шостага раённага конкурсу беларускай паэзіі і песні «Беларуская мова - мелодыя душы», які прысвечаны Дню роднай мовы. Конкурс праводзіўся ў трох узроставых катэгорыях, аб’яднаў розныя пакаленні. Складаўся з двух этапаў: адборачны этап і гала-канцэрт пераможца. Пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі і памятнымі

падарункамі, спецыяльнымі прызамі «Саюза пісьменнікаў Беларусі». Да свята падрыхтаваны выставы «Жывое ў вяках беларускае слова», «Народ жыве, пакуль жыве яго памяць». У святе прынялі ўдзел старшыня Брэсцкага аддзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» - Т. А. Дземідовіч, член «Саюза пісьменнікаў Беларусі» - Н. П. Кандрашук.

Філіял «Залеская сельская бібліятэка», 110 чал.

**25 лютага. Кобрын.** У бібліятэцы прайшло свята роднай мовы «Мова пачынаецца з дзяцінства»ў рамках сумеснага праекта з Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі «Літаратурны ліхтарык». Госцем мерапрыемства стала Наталля Кандрашук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 33 чал.

## Мерапрыемствы да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дня абаронцаў Айчыны

**13 лютага. Кобрын.** У бібліятэцы прайшла патрыятычная гадзіна «Іх подзвіг у памяці патомкаў захаваем», прымеркаваная да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 40 чал.

**14 лютага. Кобрын.** Бібліятэка для школьнікаў правяла ўрок памяці «У кожным радку - боль Афганістана». Госцем мерапрыемства стаў удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане Хаджаеў Махмасаід.

*(Во славу падших во имя живых // Кобрынскі веснік. - 2025. - 22 лютага. - С. 16).*

Філіял «Астроміцская сельская бібліятэка», 25 чал.

**14 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў прайшоў урок гістарычнай памяці «Пыл афганскіх дарог у сэрцы, памяці і кнігах».

Установа, 22 чал.

**17 лютага. Кобрын.** Прайшла гадзіна інфармацыі «Праўда гісторыі: памяць і боль». Настаўнік гісторыі Георгій Маразевіч расказаў, як жыў беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 21 чал.

**20 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК прайшла патрыятычная гадзіна «Ніхто не створаны для вайны», прысвечаная 36-й гадавіне выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

Установа, 34 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках графіку аддзела адукацыі наведання бібліятэкі, прысвечаныя тэме генацыду беларускага народа**

**1 — 28 лютага. Кобрын.** Арганізаваны цыкл мерапрыемстваў для вучняў школ горада: урок мужнасці «Старонкі канцлагернай вечнасці», патрыятычная гадзіна «Жыццё і смерць за калючым дротам», «Нявінныя ахвяры вайны», гадзіна-рэквіем «Свечка памяці ахвярам генацыду».

Установа

**Іншыя мерапрыемствы**

**3 лютага. Кобрын.** У бібліятэцы адбыўся круглы стол «Дапамога ў вырашэнні чалавечых праблем». Госці праслухалі агляд кніжнай выставы «Эмацыянальнае выгаранне».

Установа, 21 чал.

**7 лютага. Кобрын.** У рамках краязнаўчага праекта «Край, які мне дарагі» у бібліятэцы праведзена гадзіна краязнаўства «Умелі бабулі тварыць цуды».

Філіял «Стрыгаўская сельская бібліятэка», 22 чал.

**10 лютага. Кобрын.** Бібліятэка правяла гадзіну мужнасці «Адважнае маленькае сэрца», прысвечаную юным героям-антыфашыстам.

*(Узнали о юных героях // Кобрынскі веснік. - 2025. - 15 лютага. - С. 16).*

Філіял «Лукская сельская бібліятэка», 20 чал.

**10 лютага. Кобрын.** Бібліятэка правяла гадзіну мужнасці «Юныя героі ў нашай памяці жывуць». Дзецям расказалі пра жыццё і подзвігі піянераў-герояў: Марата Казея, Зіны Партновай, Лёні Голікава і іншых.

Філіял «Тэвельская сельская бібліятэка», 17 чал.

**13 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК у рамках праекта «Бібліятэка без межаў» прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «История любви на книжных страницах». У мерапрыемстве прынялі ўдзел падапечныя аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН, Кобрынскага сацыяльнага пансіяната «Нікольскі», членаў «БелТІЗ».

Установа, 48 чал.

**19 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале адбыўся семінар - практыкум «Ад рэалізаваных планаў - да новых ідэй», удзельнікамі якога сталі супрацоўнікі філіялаў ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». Былі падведзены вынікі дзейнасці ўстановы за 2024 год, намечаны планы на цяперашні год. Разглядаліся такія пытанні, як правядзенне квэст-гульняў па тэме «Захапляем чытаннем: квэст, як гульнёвая практыка працы з кнігай», «Кніжная выстава, як прасоўванне літаратуры ваеннай тэматыкі з мэтай патрыятычнага выхавання насельніцтва».

Установа, 40 чал.

**21 лютага. Кобрын.** Аддзелам абслугоўвання і інфармацыі Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы выдадзены бягучы бібліяграфічны паказальнік «Новая літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2024 год».

Установа

**25 лютага. Кобрын.** Аддзелам маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы выдадзены інфармацыйна-сцэнарныя матэрыялы «Сімвалы яднання і сувязі часоў» у дапамогу правядзення мерапрыемстваў па дзяржаўнай сімволіцы Рэспублікі Беларусь.

Установа

**25 лютага. Кобрын.** У чытальнай зале ДУК прайшла літаратурная гасцёўня «Я шчасны, што сынам быць гэтай зямлі мне лёсам наканавана», прысвечаная да 90-годдзя з дня нараджэння Рыгора Барадуліна - народнага паэта Беларусі, крытыка, перакладчыка, грамадскага дзеяча.

Установа, 24 чал.

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81